# ВЫСОЦКІ СЯРГЕЙ ІВАНАВІЧ



***В Верховном Совете много хороших аграриев, профессиональных экономистов и юристов. Но в нем не хватает решительных, ярких и сильных личностей. Не хватает волевых лидеров, способных повести за собой. Сегодня Беларуси, как никогда, нужны такие люди, как Высоцкий.***

*(Дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, адзін з вядучых эканамістаў ВС, П.У. Данэйка)*

**· *Жыве па-суседству***

Беларус. Высоцкі С.І. нарадзіўся і вырас у г.Мінску, у раёне «Зялёны Луг». Скончыў СШ №66. Бацькі — звычайныя працавітыя людзі. Маці — ўрач 17-й дзцячай паліклінікі, лечыць Вашых дзяцей. Бацька — будаўнік.

**· *Палітолаг***

У 1993 г. скончыў БДПУ, факультэт «Паліталогія, гісторыя і права». Для Беларусі **палітолаг — неабходная прафесія**. Паліталогія — гэта навука аб палітыцы і яе наступствах для людзей. Ва ўсіх прафесійных парламентах свету шмат **палітолагаў-дэпутатаў**.

**Палітолагаў-законадаўцаў** не меньш, чым эканамістаў і юрыстаў. Працуе рэдактарам газэты «За Волю», а таксама ў паліталагічным «Цэнтры спрыяння сацыяльна-палітычным рэформам».

**· *Палітык***

Яшчэ ў студэнцкія гады разам са сваімі аднадумцамі пачынае стварэнне Беларускай Партыі Свабоды, партыі патрыятычнага накірунку (**партыя не зарэгістравана з-за апазіцыйнасці пануючыму рэжыму**).

Актыўна выступае супраць дамовы аб калектыўнай бяспецы, супраць адпраўкі беларускіх хлапцоў паміраць у Чачню і Таджыкістан.

Тады ж атрымоўвае першае затрыманне міліцыяй за арганізацыю палітычнай акцыі.

Удзельнічае у акцыях падтрымкі беларускіх рабочых.

У 1995 г. заснаваў беларускую патрятычную газэту «За Волю». Газета стала ворагам урадавых злодзеяў і здраднікаў Беларускай Дзяржавы.

У тым жа 1995 г. вылучаецца кандыдатам у дэпутаты **шляхам прамой падтрымкі выбаршчыкаў**. На выбарах у Гарсавет занімае першае месца, атрымаўшы 53% галасоў. (Але фармальна выбары прызнаюцца неадбыўшыміся).

Ў 1996 г. Высоцкі і члены БПС удзельнічаюць ў акцыях пратэсту супраць насаджэння фашызму ў Беларусі, бароняць людзей ад збіцця АМОНам.

---

**ВЫСОЦКІ СЯРГЕЙ ІВАНАВІЧ — адзіны кандыдат, хто вылучаецца не па партыйных спісах, а толькі праз ПРАМУЮ ПАДТРЫМКУ ВЫБАРШЧЫКАЎ шляхам збору подпісаў**

---

**vytoki.net**

Modern History Archives
Archiv Najnovšaje Historyi
Fond ... 8 ... sprava 96

## Ў першую чэргу Высоцкі бароніць інтарэсы:

**Сям'і**, бо сям'я — гэта фундамент Дзяржавы. Беларусі патрэбны закон аб стварэнні спецыяльных фондаў для сям'і па перадавому еўрапейскаму вопыту. Выдача ільготных крэдытаў сем'ям для будаўніцтва жылля. *Але ніхто не будзе рабіць інвестыцыі ў Беларусь пры сенняшнім кіраўніцтве.*

**Дзяцей і моладзі**, бо будучыня народа ў ягоных дзецях. Асноўным прынцыпам Дзяржавы ў дачыненні да моладзі павінна стаць: "Не замінайце жыць — дайце зарабляць". Высоцкі абараняе адукацыю перад агульнай вайсковай павіннасцю. У войска — кантрактнікі, а не аспіранты. *Высокая еўрапейская адукацыя немагчымая ў ізаляванай краіне.*

**Рабочых і прадпрымальнікаў, арганізатараў вытворчасці**, бо яны галоўныя ствараальнікі матэрыяльных каштоўнасцей. Неабходна правесці рэформы, якія ажывяць заводы і павысяць заробак:

- правесці сапраўдную, а не капеечную падманную прыватызацыю, у прыватызацыйны фонд уключыць сапраўндныя багацці Беларусі — трубаправоды, нафтагазаперапрацоўчы комплекс, зямлю. Багацці Беларусі павінны належыць кожнаму грамядзяніну краіны, а не бандзе злодзеяў ды расійскаму капіталу. Прыватызацыю неабходна праводзіць па еўрапейскіх прынцыпах, калі грамацкасць ведае лес кожнага прыватызуемага аб'екту (Чэхія, Польшча). Пры такой прыватызацыі немагчыма прыхапіць. *Сумленная прыватызацыя немагчымая пры сенняшняй уладзе;*

- неабходна зменьшыць падаткі, заканадаўча абараніць вытворцаў ад сваволля ўлады. Даць свабоду ініцыятыве і канкурэнцыі;

- увесці стабільную нацыянальную валюту (за 100 000 «зайчыкаў» нельга купіць штаны);

- прыняць стабільнае эканамічнае заканадаўства па нямецкаму абразцу з мінімальнай дапрацоўкай да беларускай сітуацыі. **Толькі вольнай працай можна павысіць дабрабыт народа.**

**Пенсіянераў і ветэранаў**, бо здаровае грамацтва — гэта дапамога пажылым, непрацаздольным людзям. Змяншэнне разрыву між максімальнай і мініальнай пенсіяй — першая задача пенсіеннай сістэмы. *Народ пракляў рэжым, пры якім старыя людзі, удзельнікі вайны паміраюць ад недаядання.*

**Настаўнікаў і ўрачоў**, бо ў лўбой нармальнай дзяржаве гэтыя прафесіі — адныя з самых паважаных. Гэта аснова фармавання нашага галоўнага рэсурса — «чалавечага капітала». *Найбольш беднымі і беспраўнымі яны сталіся ў дзікунскай дзяржаве.*

**Чыноўнікаў, праваахоўчыя органы і афіцэраў**. Знішчэнне карупцыі і нажывы ў органах улады — асноўная ўмова даверу да іх людзей. Неабходна вынішчаць першапрычыны злачыннасці, а не рабіць павярхоўныя атакі. *Ніякія змены немагчымыя,пакуль ля ўлады "вертыкальныя" хапугі.* Неабходна законадаўча ўвесці адказнасць улады і прэзідэнта за выкарыстанне міліцыі і арміі супраць палітычных праціўнікаў. КДБ, міліцыя, суды павінныя займацца бандзюгамі, а не лавіць апаізіцыйных прэйдэнту палітыкаў.

***НІЯКІЯ ЗМЕНЫ ДА ЛЕПШАГА НЕМАГЧЫМЫЯ,***
***ПАКУЛЬ НЕ ВЫРАШАНАЕ ГАЛОЎНАЕ ПЫТАННЕ —***
***ПЫТАННЕ АБ УЛАДЗЕ.***

# ТОЛЬКІ РАЗАМ
# МЫ ЎЗНІМЕМ БЕЛАРУСЬ З КАЛЕНЯЎ!

КАНТАКТЫ: ТЭЛЕФОН ВЫСОЦКАГА С.І.: 261-38-37

vytoki.net